# Калейдаскоп

люты 2022

Школьная газета №6 (36)

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*

## Мова – душа народа






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**люты 2022**

***Марыя Цімінская***

**Мова мая**

**Мова мая – шум гаёў напрадвесні,
стан дзявочы бяроз,
звонкі спеў салаўя
і матуліны шчырыя песні – мова мая.
Мова мая – гэта сола заранкі,
незабудак блакіт,
перазвон ручая
і над стрэхамі шапка буслянкі – мова мая.
Мова мая – ціхі шэпат калосся,
ветру лёгкі павеў
і гудзенне чмяля,
кропка жаўранка ў паднябессі – мова мая.
Мова мая – пах дзівосны язміну,
смак крынічнай вады,
ў небе сум жураўля,
за сялом карагода рабінаў – мова мая.
Мова мая – жалкаванне жалейкі,
горкі кнігаўкі плач,
любых рук дабрыня
і валошак махнатыя вейкі – мова мая.
Мова мая – пералівы вясёлкі,
мяккі кужаль снягоў,
вечароў цішыня,
пад бажніцай купальскія зёлкі – мова мая.
Мова мая – то ўсмешка дзіцяці,
майго сэрца біццё
і пад сонцам – ралля,
хлеб духмяны ў бацькавай хаце – мова мая.**



# Народныя традыцыі

Калейдаскоп
люты 2022

## Грамніцы, альбо Стрэчанне (к. 2 лютага, п. 15 лютага)



Свята сустрэчы зімы і лета. Якое надвор’е на Грамніцы, такая будзе і вясна. Пасля гэтага дня пачыналі рыхтавацца да работ у полі. У царкве ці касцёле асвячалі грамнічныя свечкі. Яны лічыліся ахоўнымі — гаспадар з дапамогай гэтых свечак «асвячаў» хату і ўсю гаспадарку, выпальваючы імі невялікія крыжыкі на дзвярах і варотах. Верылі, што грамнічныя свечкі ратуюць будовы ад удару маланкі. З грамнічнымі свечкамі тройчы абыходзілі свойскую жывёлу на свята Юр'я, іх запальвалі на засеўкі, з імі абыходзілі хаты на Іллю і Багача, сустракалі маладых на вяселлі, дзіцятка на радзінах, клалі ў руку нябожчыку, ішлі шукаць папараць-кветку на Купалле.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**люты 2022**

**Масленіца (*Сырны тыдзень, Масленка*) — зімова-вясенні тыдзень перад пачаткам Вялікага посту, які адзначаецца ў Праваслаўнай царкве**

Прыпадае на 8-ы тыдзень да Вялікадня. Назва паходзіць ад таго, што ў канцы лютага — пачатку сакавіка каровы паспявалі ўжо ацяліцца. Тады сялянскія гаспадаркі ставаліся багатымі на малако і рабілі прадукты з яго галоўнымі на стале.



Абрадавымі стравамі тыдня былі масла, тварог і сыр. Таксама штодзень частаваліся блінамі без мяса, таму паводле хрысціянскага звычаю тыдзень называўся мясапусным — пустым ад мяса. Лічылася, што ўвесь тыдзень увечары не варта было працаваць. Пашыранымі былі вечаровыя гасцяванні і коўзанне з абледзянелых пагоркаў на санках. У чацвер, што называўся шырокім, частавалі аладкамі карову, аб'язджалі жарабцоў, што дасягнулі трохгадовага ўзросту, і абіралі вясковага пастуха на наступны год. Таксама цягам тыдню зяці мелі завітаць да сваіх цешчаў на бліны. У суботу ладзіліся залоўкіны пасядзелкі, калі гасцявалі адзін у аднаго сваякі, а моладзь запрагала ў сані коней з аздобленаю стужкамі і званочкамі вупражжу.

# Займальны матэрыял





# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**люты 2022**

### "Каб жыла культура продкаў: беларускія народныя святы, абрады, традыцыі"

**10 лютага**, у рамках беларускамоўнага чацвярга, у школьнай бібліятэцы была арганізавана выстава "Каб жыла культура продкаў: беларускія народныя святы, абрады, традыцыі".

Матэрыялы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, дазволяць наведвальнікам падрабязней пазнаёміцца з тым, як святкавалі нашы продкі найбольш значныя ў іх жыцці каляндарныя і сямейна-бытавыя святы, дапамогуць выкарыстаць элементы традыцыйнай абраднасці пры правядзенні сучасных свят грамадскага гучання і сямейных урачыстасцей.

На кожнае свята супрацоўнікі бібліятэкі распрацавалі лістоўкі з апісаннем і фотаздымкам кожнага каляндарна-абрадавага свята.

Выстава выклікала цікавасць у чытачоў, школьнікі з захапленнем знаёмяцца з яе экспанатамі.

**Загадчык бібліятэкай В.В. Маргунова, бібліятэкар Н.Г. Давыдава**





# Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
люты 2022

**17 лютага ў рамках беларускамоўнага чацвярга для вучняў 11 класа прайшло мерапрыемства «Этнаграфічны калейдаскоп»**

**17 лютага** ў рамках беларускамоўнага чацвярга для вучняў **11 класа** прайшло мерапрыемства «Этнаграфічны калейдаскоп». Вучні з цікавасцю ўзгадвалі словы і паняцці, звязаныя з беларускім адзеннем, хатняй гаспадаркай, прыладамі працы. Узнаўлялі ў памяці вядомыя прыказкі і прымаўкі, тлумачылі іх значэнне.

Мерапрыемства спрыяла пашырэнню слоўнікавага запасу, арфаграфічнай пільнасці.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Гарэева В.М.**






# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**люты 2022**

**Дзень роднай мовы**

Святкаванне Міжнароднага дня роднай мовы ў нашай школе ў 2022 годзе прымеркавана да юбілею славутага песняра Янкі Купалы, 140-годдзе з дня нараджэння якога мы будзем адзначаць у гэтым годзе.

**21 лютага** ў фае школы з раніцы гучалі беларускія песні, а вучні і настаўнікі пры ўваходзе ў школу праяўлялі эрудыцыю, адказваючы на пытанні віктарыны па беларускай лексіцы, падрыхтаванай вучнямі **8"Б" класа**. На перапынках у кабінеце беларускай мовы і літаратуры можна было не толькі паслухаць песні на вершы беларускіх паэтаў, але і стаць удзельнікам інтэрактыўнай віктарыны па творчасці славутага юбіляра Янкі Купалы. Для старшакласнікаў была праведзена агульнашкольная дыктоўка, якая стала ўжо традыцыйнай у нашай установе адукацыі.

Праведзеныя гульні, конкурсы, квэсты і агульнашкольная дыктоўка спрыялі фарміраванню грамадзянскай пазіцыі вучняў, выхаванню павагі вучняў да беларускай культуры і садзейнічалі папулярызацыі роднай мовы.

**Пышнюк А.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры**








# Папулярызацыя беларускай мовы



### Віктарына “Ведай, вучы і шануй роднае слова”

**21 лютага вучні 9 “В” класа** правялі пазнавальную віктарыну для настаўнікаў і вучняў **“Ведай, вучы і шануй роднае слова”**. Віктарына пачалася з чытання вершаў, удзельнікі адказвалі на займальныя пытанні, разгадвалі загадкі, дапаўнялі прыказкі, перакладалі словы на беларускую мову.

Мерапрыемства спрыяла пашырэнню слоўнікавага запасу і садзейнічала папулярызацыі роднай мовы.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С.А.**










# Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
люты 2022

**Турнір “Знаўца роднай мовы”**

З мэтай папулярызацыі роднай мовы **23 лютага для вучняў 5 “Б” класа** прайшоў турнір **“Знаўца роднай мовы”**. Удзельнікі выконвалі розныя заданні: тлумачылі значэнні слоў, дапаўнялі прыказкі, перакладалі словы на беларускую мову, адказвалі на пытанні, разгадвалі загадкі, выпраўлялі ў словах памылкі, складалі новыя словы з прапанаваных літар.

Мерапрыемства атрымалася цікаве і займальнае, яно спрыяла пашырэнню слоўнікавага запасу, арфаграфічнай пільнасці.

Пераможцы ўзнагароджаны граматамі і прызамі.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С.А.**



# Юбілейныя даты






**Алесь Звонак** (**сапр. Пётр Барысавіч Звонак**; 14 лютага 1907, Мінск — 2 лютага 1996, Мінск) — беларускі паэт, драматург, перакладчык, тэатразнавец. Псеўданімы: Алесін; П. Алесін; Сашка Звонак.

Нарадзіўся ў Мінску ў сям'і рабочага. Выхоўваўся ў дзіцячым доме. Пасля атрымання сярэдняй адукацыі (1925) накіраваны адказным сакратаром газеты «Чырвоная Полаччына». Узначальваў полацкую філію «Маладняка». З 1927 г. працаваў на Беларускім радыё, з 1929 годзе — у часопісе «Маладняк». У 1931 годзе скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1934 годзе — аспірантуру Акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе. Працаваў у АН БССР (1934—1935), у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1935—1936). У лістападзе 1936 года арыштаваны, у 1937 годзе асуджаны на 10 год зняволення, якое адбываў у лагерах Магаданскай вобласці. Пасля адбыцця тэрміну працаваў геолагам аб'екта, галоўным геолагам прадпрыемства (Магаданская вобласць). 29 снежня 1954 г. Вярхоўным судом рэабілітаваны. З 1955 г. жыў у Мінску. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1936 г.

З вершамі ў друку выступіў у 1925 г., а ў 1926 г. разам з Я. Бобрыкам і Я. Туміловічам выдаў зборнік «Пунсовае ранне». Аўтар зборнікаў вершаў «Буры ў граніце» (1929), «На лінію агню» (1932), «Мая Радзіма» (1935), «Табе адной» (1957), «Запаветнае» (1961, вершы і паэмы), «Россып» (1967), «Прадчуванне» (вершы і паэма, 1974), «Санеты» (1982), «Ружовая чайка» (1985), паэм «Каршун» (1930) і «Загай» (1931).

У 1977 годзе выйшлі выбраныя творы ў 2 тамах, у 1987 годзе — «Сябрына: Выбраныя творы».

Выступаў у галіне крытыкі, драматургіі тэатра і кіно. Аўтар п'есы «Навальніца будзе» па матывах трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» (1960, пастаўлена ў 1959), сцэнарыяў навукова-папулярных фільмаў «Якуб Колас» (1962), «Вобразы і думы» (1965). У 1973 г. выдаў кнігу артыкулаў і ўспамінаў «Неспакойныя сэрцы».

Пераклаў на беларускую мову творы іншых пісьменнікаў.

# Юбілейныя даты






**Міхась Лявонавіч Стральцоў** нарадзіўся 14 лютага 1937 г. у вёсцы Сычын Слаўгарадскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і сельскага настаўніка. Бацька – Лявон Клімавіч – быў дырэктарам школы, а маці – Марына Міхайлаўна – займалася хатняй гаспадаркай. Пра дзяцінства ён пазней раскажа ў сваіх творах, адзін з якіх так і будзе называцца «Дзяцінства, якое мы помнім». Гэта аповед пра пакаленне, на долю якога выпала вайна. Самі героі не ваявалі, але яны разам з дарослымі перанеслі на сваіх плячах усе выпрабаванні ваеннага ліхалецця: смерць родных людзей, пасляваенны голад і нястачу. Яны рана сталі дарослымі і назаўсёды захавалі памяць пра вайну. У 1954 г. будучы пісьменнік скончыў Нова-Ельненскую сярэднюю школу, а праз пяць гадоў (у 1959 г.) – і аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сваё далейшае жыццё Міхась Стральцоў звязаў з журналістыкай: ён працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» (1959-1961) і часопісах «Полымя» (1961-1962), «Маладосць» (1962-1968). У 1983г. незадоўга да заўчаснай смерці, стаў загадчыкам аддзела крытыкі часопіса «Нёман». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1962 г. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (1988, пасмяротна, за кнігу вершаў «Мой свеце ясны»). Пачаў пісаць у школьныя гады. Яго першыя вершы на рускай мове былі змешчаны ў вучнёўскім рукапісным часопісе «Прамень» (1952), потым з'явіліся ў раённай газеце «Калгасны шлях» (1965). Першае апавяданне «Дома» надрукаваў у 1957г. у часопісе «Маладосць». Міхась Стральцоў аўтар зборнікаў апавяданняў «Блакітны вецер» (1962), «Сена на асфальце» (1966); аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970); кнігі прозы «Падарожжа за горад» (апавяданні, аповесць, 1986); кніг выбраных твораў «На ўспамін аб радасці» (1974), «Выбранае» (проза, паэзія, эсэ, 1987). Выйшлі зборнікі вершаў «Ядлоўцавы куст» (1973), «Цень ад вясла» (1979), «Яшчэ і заўтра» (1983), «Мой свеце ясны» (1986). Міхась Стральцоў актыўна займаўся перакладчыцкай дзейнасцю. Памёр Міхась Лявонавіч Стральцоў 23 жніўня 1987 г.

# Юбілейныя даты






**Алесь (Аляксандр Уладзіміравіч) Пісьмянкоў** нарадзіўся 25 лютага 1957 года ў вёсцы Бялынкавічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў рабочай сям'і. Бацька паэта, Уладзімір Сямёнавіч, працаваў шафёрам, маці, Марыя Сямёнаўна, – медсястрой у бальніцы. На выхаванне і сталенне Алеся і яго малодшага брата Міколы ў значнай ступені паўплывалі родныя бацькоў: апавядальнікі і надзвычай гасцінныя дзед Сямён Варфаламеевіч і бабуля Анісся Васільеўна.

У 1980 годзе Алесь скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ. У 1980–1982 гадах працаваў карэспандэнтам у аддзеле крытыкі і бібліяграфіі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», у 1982 годзе перайшоў у часопіс «Полымя» на пасаду рэдактара аддзела навукі і мастацтва. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (з 1984), у 1990 годзе абраны сакратаром Саюза. Пазней вяртаецца ў «Полымя» намеснікам галоўнага рэдактара, але потым зноў перайшоў у «ЛіМ» на пасаду галоўнага рэдактара (1999–2002). У 2002 годзе перайшоў у рэдакцыю часопіса «Вожык» (2002–2004). Не абышлі яго і ўзнагароды. Ён лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола БССР (1988) за кнігу лірыкі «Чытаю зоры», лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1998) за кнігу «Вершы», лаўрэат прэміі «Залаты апостраф» (2004, пасмяротна).

Алесь Пісьмянкоў – паэт рамантычнага светаўспрымання. Яго паэзія пранізана глыбокім пачуццём лірызму, пранікнёным пафасам патрыятызму і чалавечнасці.

# Літаратурная старонка



## Месяц люты

**Вясёлы месяц люты,**
**Мяцеліцай раскуты, —**
**Шумі вятрамі, грай!**
**Вятры пабралі лютні,**
**Імчаць у свет бязлюдны.**
**Праводзіны?**
**Адходзіны?**
**Зіме?**
**Гэй, пачынай!**
**Давай!**
**Давай!**
**Ах, ах, ды ў гэтым месяцы**
**Яшчэ забіты весніцы,**
**Марозам прымарожана,**
**Прымружана**
**Шчэ лужына**
**Завейлівым сняжком.**
**Гудзе вятрамі вуліца,**
**Як бубен дом.**
**Мяцеліца пасцелецца**
**Ад рання да цямна.**
**Апоўначы насмеліцца**
**Адліга —**
**Месяц крыгай**
**Да самага відна.**
**А зорка — во свавольніца! —**
**Пад раніцу расколецца**
**Аб шыбіну акна.**
**— Скажыце! Навіна!**
**Кажыце не кажыце,**
**Ідзе вясна!**

**Міхась Стральцоў**

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**люты 2022**






**Рэдкалегія:**

**Аліева Анастасія (9в),**
**Кузьміна Кацярына (9в),**
**Прасаловіч Юлія (9в),**
**Сарокіна Вікторыя (9в),**
**Федарэнка Вікторыя (9в).**
**Рэдактар Юрчанка С.А.**